Тэхналагічная карта ўрока па тэме “Зваротак”

| Этапы ўрока | Час | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Метады і формы навучання | Прагназуемы вынік | Абсталяванне |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Арганізацыйна-матывацыйны | 5 | Вітаецца. Арганізуе работу ў класе. Вызначае настрой у пачатку ўрока. Знаёміць вучняў са старажытнагрэчаскім выслоўем і выслоўем іспанскага пісьменніка. Прапануе адказаць на пытанні, вызначае тэму і мэты ўрока. Стварае сітуацыю поспеху. | Слухаюць, адказваюць на пытанні, вызначаюць мэты і задачы ўрока | Гутарковы метад, дыялог, бяседа | Стварэнне добразычлівай атмасферы. Разуменне мэт і задач урока | Мультымедыйная дошка, сшыткі, дошка |
| Вывучэнне новага матэрыялу | 15 | Знаёміць са значэннямі слоў “адрасат” і “адрасант”. Стварае ўмовы для знаёмства са звароткам. Вучыць асэнсоўваць функцыі зваротка, азнаямляе са спосабамі выражэння і месца ў сказе. Знаёміць з правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах са звароткамі. | Вучні працуюць з тлумачальным слоўнікам. Даведваюцца пра таго, хто можа выступаць у якасці адрасата. Працуюць з падручнікам, выконваюць практыкаванні, у якіх вызначаюць звароткі, назіраюць за месцам зваротка ў сказах і пастаноўкай знакаў прыпынку пры іх. Чытаюць правілы ў падручніку. Чытаюць сказы са звароткамі з асобай клічнай інтанацыяй. | Гутарковы, дыялог, групавая работа, самастойная работа, работа з падручнікам | Развіццё пазнавальнай цікавасці да тэмы ўрока. Развіццё маўленчай дзенасці вучняў. | Мультымедыйная дошка, сшытак, падручнік |
| Фізкультхфілінка | 1 | Настаўнік тлумачыць сэнс гульні | Вучні стоячы перакідваюць адзін аднаму мячык і называюць суседа, карыстаючыся словамі ветлівасці, запісанымі на дошцы | Гульня | Стварэнне добразычлівай атмасферы. Адпачынак. | Мультымедыйная дошка |
| Вывучэнне новага матэрыялу | 7 | Развівае арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні і навыкі.  Вучыць знаходзіць звароткі ў сказе, адрозніваць ад назоўнікаў у назоўным склоне ў ролі дзейніка, | Вучні чытаюць правіла ў падручніку пра пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротку, даведваюцца пра тое, што зваротак не з’яўляецца членам сказа. Пры адказах карыстаюцца табліцай на | Гутарковы, дыялог, групавая работа, самастойная работа, работа з | Развіццё пазнавальнай цікавасці да тэмы ўрока. Развіццё маўленчай | Мультымедыйная дошка, сшытак, падручнік, карткі з заданнямі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | выкарыстоўваць у маўленчай сітуацыі. Пашырае слоўнікавы запас вучняў. | дошцы (дадатак 3). Робяць сінтаксічны разбор сказа са зваротkам разам з настаўнікам. Гуляюць у гульню “Рамонак”. Пісьмова самастойна выконваюць практыкаванне ў падручнку (выпісваюць сказы са зваротkамі і ставяць знакі прыпынку пры іх). Працуюць у парах з заданнямі ў картках (знаходзяць зваротkі), мяняюцца адзін з адным для праверкі (дадатак 1) | падручнікам, работа ў парах | дзенасці вучняў | |
| Замацаванне ведаў | 10 | Вучыць правільна інтанаваць сказы са зваротkам, афармляць на пісьме. | Вучні пісьмова каля дошкі працуюць з заданнямі, размешчанымі на мультымедыйнай дошцы (перабудоўваюць сказы так, каб выдзеленыя словы сталі зваротkамі). Выконваюць праверачны тэст (дадатак 2) | Гутарковы, дыялог, групавая работа, самастойная работа, работа з падручнікам, работа з тэстам | Замацаванне новага матэрыялу | Мультымедыйная дошка, сшытак, падручнік, карткі з тэстам |
| Інфармацыя аб дамашнім заданні | 1 | Задае дамашняе заданне вучням (рознаўзроўневае) | Знаёмяцца з інфармацыяй аб дамашнім заданні, запісваюць у вучнёўскі дзённік | | Замацаванне і паўтарэнне новага матэрыялу | Вучнёўскі дзённік |
| Этап рэфлексіі | 5 | Арганізуе рэфлексійную дзейнасць вучняў. Звяртаюцца да высновы эпіграфа. Прапануе наклеіць лісце на дрэва згодна з застроем вучняў | Абменьваюцца думкамі. Асэнсоўваюць эпіграф. Наклейваюць на дрэва лісце. | Гутарковы дыялог | Паўтарэнне новага матэрыялу | Плакат з выявай дрэва, дошка, лісце |
| Этап падвядзення вынікаў | 1 | Ажыццяўляе ацэначную дзейнасць. Адзнакі выстаўляе каменціравана | Асэнсоўваюць вынікі сваёй работы на ўроку. | Гутарковы дыялог | Станоўчы эмацыянальна–псіхалагічны стан вучняў | |